# ПРАДМОВА

Адам Антонавіч Грымаць на працягу ўсёй сваёй творчай дзейнасці імкнуўся да прадуктыўнага пераўтварэння педагагічнай рэчаіснасці. Прагнастычнае бачанне шляхоў развіцця педагагічнай навукі і практыкі адлюстроўвае яго навуковы кругагляд, спектр навуковых інтарэсаў.

Створаная прафесарам А. А. Грымацем навуковая школа з'яўляецца творчай крыніцай развіцця наступных навуковых напрамкаў: падрыхтоўка педагагічных кадраў у Рэспубліцы Беларусь; рэалізацыя дзейнаснага падыходу ў вывучэнні педагагічных дысцыплін; маральнае выхаванне і сацыялізацыя моладзі. Вядомы вучоны падрыхтаваў 30 кандыдатаў навук.

Аўтар кнігі — дацэнт Лідзія Аляксандраўна Казінец з'яўляецца вучаніцай прафесара А. А. Грымаця. Напісаная ёю кніга яшчэ раз сведчыць аб пераемнасці ў развіцці педагагічных ідэй. Кніга створана на аснове вывучэння прац педагога, успамінаў калег па працы, вучняў і ўяўляе магчымасць паўней пазнаёміць чытачоў з жыццёвым і творчым шляхам даследчыка, ацэнкай яго дзейнасці вядомымі вучонымі, настаўнікамі-практыкамі, аспірантамі і студэнтамі.

Маральны і навуковы патэнцыял кнігі з'яўляецца крыніцай духоўнага развіцця будучых пакаленняў вучоных і настаўнікаў. На яе старонках адлюстравана бязмежная любоў сям'і, аспірантаў, калег па працы да Адама Антонавіча.

Лёс звёў мяне таксама з гэтым цудоўным Чалавекам. Вельмі ўдзячны яму за карысныя парады і падтрымку ў час абмеркавання на кафедры педагогікі маёй доктарскай дысертацыі. І зараз, працуючы загадчыкам гэтай кафедры, адчуваю падтрымку яго вучняў, выкарыстоўваю ў сваёй дзейнасці арыгінальныя навуковыя і педагагічныя знаходкі таленавітага вучонага.

Педагагічная грамадскасць Беларусі шырока адзначае 65-годдзе з дня нараджэння А. А. Грымаца. Да яго навуковых ідэй сёння звяртаюцца вучоныя, з вялікай аддачай іх выкарыстоўваюць настаўнікі-практыкі. У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка пройдуць «Педагагічныя чытанні», прысвечаныя юбілею навукоўцы.

Выхад у свет гэтай кнігі створыць падмурак для далейшага укаранення і развіцця навукова-педагагічных ідэй прафесара Адама Антонавіча Грымаца.

*І. І. Цыркун,*
доктар педагагічных навук,
прафесар